# ВЫКАРЫСТАННЕ ЭМОДЖЫ Ў БЕЛАРУСКАЙ КАМУНІКАЦЫІ

*Кнапп А.Э., Чумачоў М.К.*

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

*Албут А.А. – старшы выкладчык*

Разгледжаны асаблівасці выкарыстання, роля, эмоджы ў сучаснай беларускай каунікацыі. Эмоджы, як і камунікацыя ўвогуле, нясуць адбітак культуры, дзе ўзніклі. Таму бачыцца важным вывучэнне гэтага ўжо неад’емнага кампанента нашых зносін.

Актуальнасць тэмы нашага даследавання адлюстроўваецца ў шматлікіх аспектах. Сучасная камунікацыя, асабліва ў сацыяльных сетках і пісьмовых месенджарах, сутыкаецца з узрастаннем папулярнасці эмоджы ў тэкставых паведамленнях. Эмоджы сталі неабходнай часткай нашай камунікацыі, дазваляючы выразіць эмоцыі і пачуцці ў лічбавым асяроддзі.

У беларускай мове выкарыстанне эмоджы таксама набывае папулярнасць, але мала даследавана. Мэта нашага даследавання – разабрацца ў выкарыстанні эмоджы ў беларускай мове, выявіць асаблівасці і ўплыў на камунікацыю.

Эмоджы, ці эмадзі, гэта малюнкавыя сімвалы, якія выкарыстоўваюцца для выразнага выяўлення эмоцый, пачуццяў і адносін ў тэкставых паведамленнях і сацыяльных медыя. Мы разгледзім ролю эмоджы ў камунікацыі, іх дапамогу ў змяненні і паляпшэнні зразумеласці паведамленняў, і павелічэнні эмацыйнай выразнасці ў сучаснай аддаленай камунікацыі [1].

Першыя эмоджы былі створаныя ў Японіі. Слова *эмоджы (emoji)* паходзіць ад японскага "絵" (e), што азначае ‘малюнак’, і "文字" (moji), што азначае ‘пісьмо’. Эмоджы былі створаны ў канцы 20 ст. японокімі інжынерамі і пачалі выкарыстоўвацца ў тэкставай камунікацыі для выразнага выяўлення эмоцый.

Пасля свайго стварэння эмоджы хутка распаўсюдзілюя па ўсім свеце, прыводзячы да іх шырокага выкарыстання ў розных культурах і мовах. У розных мовазнаўчых і культурных кантэкстах эмоджы могуць мець розныя асаблівасці. Напрыклад, значэнне некаторых эмоджы можа змяніцца ў залежнасці ад культурных нюансаў [2].

Гісторыя эмоджы і іх выкарыстанне ў розных мовах і культурах паказваюць, як гэтыя сімвалы сталі часткаю сучаснай камунікацыі і ўзаемадзейнасці і як іх значэнне можа змяніцца ў залежнасці моўнага і культурнага асяроддзя.

Эмоджы ў беларускай камунікацыі маюць свае асаблівасці, якія адлюстроўваюць спецыфіку культуры. Напрыклад, беларускія эмоджы могуць мець элементы беларускай нацыянальнай сімволікі або элементы традыцыйнага беларускага адзення.

У камунікацыі эмоджы выкарыстоўваюцца для выразнага абазнацэння тэмы або акцэнту на яе. Напрыклад, у апісанні Калядаў можна выкарыстоўваць эмоджы 🎄 для вылучэння асноўнага сімвала гэтага свята. Такім чынам, эмоджы не проста дадаюць каляровасці тэкставай камунікацыі, а таксама дапамагаюць акцэнтаваць тэмы і ідэі.

Эмоджы могуць быць эфектыўным сродкам для выразнай падачы эмоцый і пачуццяў у беларускай камунікацыі. Напрыклад, эмоджы 😂 можна выкарыстоўваць для адлюстроўвання смешных момантаў. іх выкарыстанне дазваляе лепш паказаць эмоцыі [3].

Уплыў эмоджы на эфектыўнасць камунікацыі можа быць значным і мае свае пазітыўныя і негатыўныя аспекты. Да пазітыуных аспектаў можна аднесці тое, што эмоджы дазваляюць дадаць эмацыйную глыбіню і асаблівасць тэксту, дапамагаючы лепш выразіць аўтэнтычныя пачуцці або стан адпраўніка паведамлення. Эмоджы часам выкарыстоўваюцца для змякчэння тону камунікацыі ці для падачы дадатковай інфармацыі аб тоне паведамлення. Таксама выкарыстанне эмоджы можа стварыць індывідуальны стыль камунікацыі, які адлюстроўвае пачуцці і асаблівасці моўцы.

Аднак некаторыя эмоджы могуць адрозніваціа ў розных нацыянальных кантэкстах, што можа прывесці да неразумення ці памылак у інтэрпрэтацыі. Гэты момант адносіцца да негатыўных аспектаў. У дзелавой камунікацыі ці фармальных сітуацыях выкарыстанне эмоджы можа вызначацца як неадпаведнае моманту і можа зменшыць афіцыйны тон паведамлення. У некаторых выпадках людзі могуць выкарыстоўваць эмоджы як замену словам, што можа прывесці да абмяжоўвання слоўнікавага запасу ў камунікацыі [4].

Эмоджы сталі неаддзельнай часткаю камунікацыі ў розных сферах. У сацыяльных сетках, дзе камунікацыя часта абмежавана тэкставай формай, эмоджы дапамагаюць карыстальнікам выразіць свае эмоцыі, рэакцыі і адносіны да запісаў ці паведамленняў. Асабліва ў месенджарах эмоджы могуць выкарыстоўвацца для стварэння індывідуальнага стылю камунікацыі. Карыстальнікі могуць выбіраць эмоджы ў адпаведнасці са сваімі густамі ці для падкрэслівання тэмы. У гульнях і іншых відах камп'ютарнай камунікацыі эмоджы выкарыстоўваюцца для выразнага адлюстравання эмоцый, стратэгій і каманднай арганізацыі. У рэкламных кампаніях і брэндынгу эмоджы могуць быць выкарыстаныя для таго, каб падкрэсліць рэкламнае паведамленне, і для вылучэння індывідуальнага стылю [5].

Даследаванне выкарыстання эмоджы ў беларускай камунікацыі мае значэнне для разумення як культурных, так і лінгвістычных асаблівасцей іх выкарыстання. Эмоджы сталі неад'емнай часткай беларускай мовы ў розных сферах, уключаючы сацыяльныя сеткі, месенджары, гульні і іншыя камунікатыўныя пляцоўкі. Гэтае даследаванне паказвае, як эмоджы выглядаюць у сукупнасці са звычайнай беларускай мовай. Вынікі даследавання могуць паслужыць асновай для развіцця культуры выкарыстання эмоджы ў беларускай мове, а таксама для рэкамендацый па выкарыстанні ў асобных сітуацыях, напрыклад, падчас культурных мерапрыемстваў. У выніку разуменне асаблівасцей выкарыстання эмоджы ў беларускай мове можа прынесці карысць не толькі даследчыкам, але і ўсім карыстальнікам беларускай мовы ў іх камунікатыўнай практыцы.

***Спіс выкарыстаных крыніц:***

*1. Эмодзи — что это такое, зачем нужны и как ними пользоваться [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://dzen.ru/a/YLhnBYcrPFxD06jF. – Дата доступа : 25.11.2023.*

*2. Что эти эмоджи значат в Японии [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://www.youtube.com/watch?v=DXB_3w6xRN4. – Дата доступа : 01.12.2023.*

*3. Эмодзи как феномен цифровой коммуникации XXI века [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.alba-translating.ru/ru/ru/articles/2019/uskova-2019.html. – Дата доступа: 20.11.2023.*

*4. Как и почему эмодзи портят онлайн-переписку [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://habr.com/ru/companies/vdsina/articles/550858/. – Дата доступа : 17.11.2023.*

*5. Как повысить эффективность рекламы при помощи эмодзи [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://apix-drive.com/ru/blog/marketing/jemodzi-v-reklame – Дата доступа : 27.11.2023.*